# 450 LAT UNII LUBELSKIEJ

450 ГАДОЎ
ЛЮБЛІНСКАЙ
УНІІ

1569 ★ 2019



ЯН МАТЭЙКА
*Люблінская унія*, 1869
алей, палатно (фрагмент)

дэпазіт Нацыянальнага
музея ў г. Варшаве
ў Люблінскім музеі
ў г. Любліне

Карціна намаляваная ў 1869 г. з нагоды 300-годдзя Люблінскай уніі. Палатно не з'яўляецца дакладным адлюстраваннем, гэта, хутчэй, бачанне падзей XVI стагоддзя мастаком, свядомы філасофска-гістарычны адказ на тэму агульнага польска-літоўска-рускага мінулага. Ян Матэйка прадставіў на карціне момант ратыфікацыі дакумента. Падзеі адбываюцца ўнутры Люблінскага замка, а зала выглядае, як пакоі ў Вавэлі.



*Шаноўнае спадарства,*

*у 2019 годзе спаўняецца 450 гадоў са дня падпісання Люблінскай уніі. Сейм Рэспублікі Польшча, жадаючы падкрэсліць гэтую важную гадавіну, рашэннем з 20 ліпеня 2018 г. назваў 2019 год годам Люблінскай уніі.*

*Менавіта ў Любліне ўжо ў XVI стагоддзі падкрэсліваліся каштоўнасці і ідэі, якія з цягам часу стварылі фундамент Еўрапейскага саюза. Горад Люблін, дзякуючы Люблінскай уніі, стаў своеасаблівай крыніцай сучаснай Еўропы, якая з'яўляецца мазаікай розных народаў і культур. Дзякуючы выключнаму святкаванню ў 2019 годзе, у Любліна з'явіцца магчымасць узгадаць сваю істотную ролю ў заснаванні еўрапейскай супольнасці народаў.*

*Перад намі таксама 15 гадавіна далучэння Польшчы да Еўрапейскага саюза. Мы б хацелі згадаць словы св. Яна Паўла II, адзначаючы гэты год пад лозунгам "Ад Люблінскай уніі да Еўрапейскага саюза", і паказаць пры гэтым, як карыстацца спадчынай і досведам Люблінскай уніі падчас стварэння будучыні Еўрапейскага саюза.*

*Шчыра запрашаем!*

Д-р Кшыштаф Жук,
Мэр горада Любліна




*Люблін у 1618 г. – від горада Люблін Хогенберга і Брауна*

Падпісаная ў 1569 годзе Люблінская унія была шматузроўневай падзеяй, якая на шмат гадоў акрэсліла палітычны і грамадскі лад у нашай частцы Еўропы. Створаная тады Рэч Паспалітая з'ўлялася рэдкай у гісторыі ўдалай спробай пабудаваць сталы парадак у адносінах паміж прадстаўнікамі розных нацый, культур і рэлігій. Люблін – месца, у якім перакрыжаваліся шляхі, што спалучалі найважнейшыя гарады аб'яднанай дзяржавы – дзякуючы гэтаму ён атрымаў статус аднаго з цэнтраў тагачасных змен.

Люблінская унія, з аднаго боку, стала ўрокам палітычнага рэалізму і нялёгкага таленту будаваць дамоўленасці па-над падзеламі. З другога боку – на працягу гадоў яна атрымала сімвалічнае значэнне, як прыклад стварэння адзінасці “свабодных са свабоднымі, роўных з роўнымі”. З гэтага пункту гледжання, Карона і Літва, якія згодна падалі сабе рукі, разам стварылі прастору свабоды і павагі да права. Пэўна, менавіта гэты пункт гледжання на унію спрычыніўся да таго, што памяць пра яе вытрывала падзелы Рэчы Паспалітай, часы анексіі і бурлівае ХХ стагоддзе.

Свядомасць узнёслага характару падзей 1569 г. стала істотным элементам тоеснасці Любліна і жыхароў горада. Пра гэта сведчыць помнік, пастаўлены адразу ж пасля падпісання уніі. Паводле традыцыі яго паставілі ў месцы, дзе знаходзіўся лагер гістарычнай літоўскай шляхты, якая прыехала на аб'яднальны сейм, пра што да сённяшніх часоў нагадвае назва буйнейшай плошчы ў цэнтры нашага горада. Помнік, пабудаваны нанова ў 1826 г. па ініцыятыве Станіслава Сташыца, хутка стаў адным з сімвалаў г. Любліна, месцам сходаў і патрыятычных дэманстрацый. Ён нагадвае пра веліч былой Рэчы Паспалітай і палітычнвую мудрасць яе грамадзян.

**Праз 450 гадоў пасля гэтых падзей варта, аднак, вярнуцца не толькі да сфарміраванай вакол іх легенды. Трэба таксама зноўку задумацца над ацэнкай уніі, паглядзець на гэтыя падзеі з шырокай перспектывы, што ўлічвае інтарэсы ўсіх народаў, якія сёння жывуць на землях былой Рэчы Паспалітай, яшчэ раз разгледзець розныя наступствы 1569 г., узгадаць і падумаць над яго спадчынай.**

Праграма святкавання “Ад Люблінскай уніі да Еўрапейскага саюза”, прыгатаваная з гэтай выключнай нагоды, ахоплівае арганізацыю шэрагу культурных падзей, канцэртаў, выстаў, спектакляў і канферэнцый, якія адбудуцца напрацягу года. Галоўнае святкаванне запланаванае на перыяюд з 1 мая да 1 ліпеня 2019 года, яно ахопіць дзве важныя гадавіны: 15-годдзе далучэння Польшчы да Еўрапейскага саюза (1 мая) і 450-годдзе падпісання Люблінскай уніі (1 ліпеня). Да арганізацыя святкавання актыўна далучыліся гарады-партнёры і гарады-сябры, люблінскія школы і ўніверсітэты, а таксама шмат навуковых і культурных устаноў у краіне і па-за яе межамі.

# Праграма юбілею 450-годдзя Люблінскай уніі “Ад Люблінскай уніі да Еўрапейскага саюза”

## НЕКАТОРЫЯ ПАДЗЕІ

**СЕЗОН ЛЮБЛІН** / 26 красавіка – 5 мая
Больш за 100 падзей, прысвечаных Люблінскай уніі, у прыватнасці, тэматычныя шпацыры, роварныя экскурсіі, мастацкія і кулінарныя майстар-класы, наведванне аб'ектаў.
АРГАНІЗАТАР: горад Люблін / sezon.lublin.eu

**СВЯТА ДВУХ САЮЗАЎ / 1 – 5 мая**

- **„САЮЗ НА ЛІТОЎСКАЙ”** – 15-годдзе ўступлення Польшчы ў Еўрапейскі саюз - сямейны пікнік, гульні, спектаклі, канцэрты і **ДНІ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ ЕЎРАПЕЙСКІХ ФОНДАЎ**
- **КАНЦЭРТ АРКЕСТРА ЛЮБЛІНСКАЙ ФІЛАРМОНІІ НА ЛІТОЎСКАЙ ПЛОШЧЫ / 1 мая** польскія і літоўскія кампазіцыі, а таксама *“Ода да радасці”* (гімн Еўрапейскага саюза)
- урачыстае адкрыццё **ПАКАЗАЎ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫХ ФАНТАНАЎ** на Літоўскай плошчы / **3 мая** прэм'ера паказу, натхнёнага гісторыяй і спадчынай Люблінскай уніі
АРГАНІЗАТАР: горад Люблін

**КАНГРЭС ДВУХ САЮЗАЎ / 13 – 15 мая**
Дэбаты, канферэнцыі, сустрэчы.

- **“СВЯТА ДВУХ САЮЗАЎ – АД ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ ДА ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА”** – пасяджэнне Знаку еўрапейскай спадчыны, арганізаванае офісам Гарадскога рэстаўратара помнікаў / **13-14 мая**
- **КАНФЕРЭНЦЫЯ “СУПОЛЬНАСЦЬ І САМАКІРАВАННЕ”**, арганізаваная Факультэтам паліталогіі Універсітэта Марыі Складоўскай-Кюры / **15 мая**
- **“ЛЮБЛІН З ЧАСОЎ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ”** – пасяджэнне Ваяводскага рэстаўратара помнікаў/ **15 МАЯ**

**ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ФІФА U-20** /
**23 мая – 11 чэрвеня**
Вялікае свята спорту – Люблін будзе адным з гаспадароў гэтага мерапрыемства.

**ФЕСТЫВАЛЬ ХАРОЎ ГАРАДОЎ-ПАРТНЁРАЎ ЛЮБЛІНА** / **30 мая - 1 чэрвеня**
Сустрэча хароў з Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны.
АРГАНІЗАТАР: горад Люблін, Універсітэт Марыі Складоўскай-Кюры ў г. Любліне, Люблінская філармонія імя Г. Веняўскага



**НОЧ КУЛЬТУРЫ Ў ЛЮБЛІНЕ** / **1/2 чэрвеня**
а таксама **НОЧ КУЛЬТУРЫ Ў ВІЛЬНІ** / **15/16 чэрвеня**
Прэзентацыя літоўскіх мастакоў у Любліне, у прыватнасці, з Вільні, Коўна (Культурная сталіца Еўропы 2022) і Панявежыса (горада-партнёра), а таксама візіт у адказ люблінскіх мастакоў у Вільню на Ноч культуры.
АРГАНІЗАТАР: Майстар-класы культуры ў Любліне (“Warsztaty Kultury w Lublinie”)

**ХАРЦЭРСКАЯ ЛЮБЛІНСКАЯ ГУЛЬНЯ Ў ПАМЯЦЬ АБ УНІІ** / **8 чэрвеня**
Сустрэча харцэраў з Польшчы і Літвы.
АРГАНІЗАТАР: атрад Саюза польскіх харцэраў у Любліне

**УНІЯ ПА РАЁНАХ – чэрвень – ліпень**
У рамах праекта запланавана некалькі мастацкіх падзей у розных раёнах Любліна.
АРГАНІЗАТАР: Цэнтр культуры ў г. Любліне

**ФЕСТЫВАЛЬ ЛЮБЛІНСКІХ ЛЕГЕНД** /
**14 – 15 чэрвеня**
Рынкавая плошча старога горада стане месцам інсцэнізацыі, тэатральных і музычных мерапрыемстваў, якія адлюстроўваюць падзеі і настрой мінулых часоў.
АРГАНІЗАТАР: горад Люблін

**МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ РЭНЕСАНСУ** /
**21 – 23 чэрвеня**
Горад ахопяць танцы, музыка, тэатр і гістарычнае жангляванне сцягамі часоў дынастыі Ягелонаў.
АРГАНІЗАТАР: Фонд “Belriguardo” – вакно на гісторыю і мастацтва (“Fundacja Belriguardo – okno na historię i sztukę”)

**УСХОД КУЛЬТУРЫ - ІНШЫЯ ГУЧАННІ “ART'N'MUSIC FESTIVAL”** / **27 – 30 чэрвеня**
Фестываль запрашае самых цікавых мастакоў з памежжа відаў, традыцыі і культурных уплываў.
АРГАНІЗАТАР: Майстар-класы культуры ў Любліне

**СВЯТКУЕМ УНІЮ** / **28 чэрвеня – 4 ліпеня**
Канцэрты старажытнай і сучаснай музыкі, сумесны спеў “Te Deum Laudamus”, захапляльныя паказы і рыцарскія рэканструкцыі, шпацыры і наведванне аб'ектаў, звязаных з Люблінскай уніяй.

**ДЗЕНЬ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ** / **1 ліпеня**
Афіцыяльная святкаванне – набажэнства ў базіліцы дамініканцаў і ўрачыстае пасяджэнне Рады горада Любліна. Пасля абеду адбудзецца сямейны пікнік, а ўвечары – мультымедыйны паказ.
АРГАНІЗАТАР: горад Люблін

**КАНГРЭС *“UT UNUM SINT”*** / **4 – 7 ліпеня**
Міжнародная сустрэча дзіцячых хароў.
АРГАНІЗАТАР: Польская федэрацыя “Pueri Cantores” (“Polska Federacja Pueri Cantores”)

**ФЕСТЫВАЛЬ АБОДВУХ НАРОДАЎ** / **5 – 7 ліпеня**
Фальклорная сустрэча груп з Польшчы і Літвы, а таксама з тэрыторыі былых Усходніх Крэсаў.
АРГАНІЗАТАР: Ансамбль песні і танца “Люблін” імя Ванды Каняровай

**КАНГРЭС ЕЎРАПЕЙСКІХ ШЛЯХОЎ СЕЙМА ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ Ў Г. ЛЮБЛІНЕ** / **14 – 17 ліпеня**
Сустрэчу арганізуе Саюз шляхоў “Захад – Усход” (Unię Szlaków „Zachód – Wschód”).

## СПАДАРОЖНЫЯ ПАДЗЕІ

**ЛАЎР РЭСТАЎРАТАРАЎ 2019 / 17 красавіка**
Уручэнне ўзнагарод у рамах 20-га Ваяводскага адкрытага конкурсу "Лаўр рэстаўратараў" („Laur Konserwatorski").

**XXVI АГУЛЬНАПОЛЬСКІ АГЛЯД ГАРАДСКІХ СІГНАЛАЎ ЧАСУ, ЯКІЯ ГРАЮЦЬ ТРУБАЧЫ/ / 15 жніўня**
АРГАНІЗАТАР: Агульнапольскае таварыства аматараў гарадскіх сігналаў часу, якія граюць трубачы

**ЯГЕЛОНСКІ КІРМАШ / 16 – 18 жніўня**
Фестываль звяртаецца да традыцыі люблінскіх кірмашоў, пачатак якіх сягае XV стагоддзя.
АРГАНІЗАТАР: Майстар-класы культуры ў Любліне

**ЕЎРАПЕЙСКІ ФЕСТЫВАЛЬ СМАКУ "ЛІТВА" / 2 – 8 верасня**
Прэзентацыя прадстаўнікоў з Літвы, Польшчы і ўсёй Еўропы. Гэта будзе час канцэртаў, сустрэч з паэтамі, спектакляў і выстаў.
АРГАНІЗАТАР: *"Крэсавая акадэмія смаку" ("Kresowa Akademia Smaku").*

**XX АГУЛЬНЫ З'ЕЗД ПОЛЬСКІХ ГІСТОРЫКАЎ І ЗАМЕЖНЫХ ГАСЦЕЙ / 18 – 20 верасня**
Дэбаты і сустрэчы навукоўцаў, роздумы над вялікімі зменамі ў гісторыі.
20 верасня разыграецца **рэканструкцыя прыёму**, што адбыўся пасля падпісання Люблінскай уніі.
АРГАНІЗАТАР: Польскае гістарычнае таварыства, Універсітэт Марыі Складоўскай-Кюры, Каталіцкі ўніверсітэт у г. Любліне імя Яна Паўла II і Дзяржаўны архіў у г. Любліне.

**КАНГРЭС ІНІЦЫЯТЫЎ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ / 23-24 верасня**
Палітыкі Усходняй Еўропы сустрэнуцца перад абліччам 450-годдзя Люблінскай уніі, 10-годдзя прысутнасці Польшчы ва Усходнім партнёрстве і 15-годдзя далучэння Польшчы да Еўрапейскага саюза.
АРГАНІЗАТАР: горад Люблін

**ТЫДЗЕНЬ ЛЮБЛІНСКАГА РАМЯСТВА / 29 верасня – 6 кастрычніка**
Канферэнцыя, канцэрты, сустрэчы, выставы і прэзентацыя люблінскага рамяства.
АРГАНІЗАТАР: Палата рамяства і прадпрымальніцтва ў г. Любліне

## АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА:

**ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ Ў ШКОЛЕ / з 25 лютага**
Урокі пра значэнне Люблінскай уніі, якія рэалізуюцца на падставе ўніверсальнага сцэнара, апрацаванага настаўнікамі з III Агульнаадукацыйнага ліцэя імя Люблінскай уніі. Сцэнар даступны для спампоўвання на сайце **unia.lublin.eu**

**ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ / гадавая праграма**
Адмысловая праграма, створаная для люблінскіх дашкольнікаў, якая скончыцца вялікім канцэртам на тэму уніі, падрыхтаваным люблінскімі садкамі.

**ФОРУМ ПАДЗЕМНЫХ ТРАС / 8 – 10 сакавіка**
Цыклічная сустрэча суб'ектаў, што вядуць падземныя аб'екты па ўсёй Польшчы.

**ЛЯЛЕЧНАЯ ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ**
Выстава калекцыі мастацкіх лялек, стварэнне якіх натхніла карціна Яна Матэйкі "Люблінская унія", у Літаратурным музеі імя Юзафа Чаховіча і прэзентацыя ў пачатковых школах і садках на тэрыторыі горада.

**ПЛЕНЭРНЫ ЛЯЛЕЧНЫ СПЕКТАКЛЬ ПРА ЛЮБЛІНСКУЮ УНІЮ**
Надзвычайнае прадстаўленне пленэрнага лялечнага спектакля, адрасаванага самым малодшым жыхарам горада.
АРГАНІЗАТАР: Тэатр імя Х. К. Андэрсэна

**АДУКАЦЫЙНЫ ПАРТАЛ ПРА ЛЮБЛІНСКУЮ УНІЮ і ПУБЛІКАЦЫЯ *"АЗБУКА ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ"***
Адукацыйны сайт, прысвечаны Люблінскай уніі. Да сайта далучыцца адукацыйная публікацыя "Азбука Люблінскай уніі".
ORGANIZATOR: Ośrodek „Brama Grodzka - Teatr NN"

**ЦЫКЛ АДКРЫТЫХ ЛЕКЦЫЙ "ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ І ЯЕ ТРАДЫЦЫІ" / люты – снежань**
Цыкл адкрытых лекцый адбудзецца ў Ваяводскай бібліятэцы імя І. Лапацінькага.

**ФАТАГРАФІЧНЫ ЛЮБЛІН – 450 ГАДОЎ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ**
Майстар-класы і конкурс фатаграфіі для вучняў.
АРГАНІЗАТАР: III Агульнаадукацыйны ліцэй імя Люблінскай уніі

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ ДА СВЯТКАВАННЯ!

Праграма святкавання 450-годдзя падпісання Люблінскай уніі мае адкрыты характар, арыентаваны на сумесныя дзеянні з жыхарамі горада.

**450-ГОДДЗЕ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ – КОНКУРС ІНІЦЫЯТЫЎ ЖЫХАРОЎ**
Адкрыты набор тэматычных ініцыятыў жыхроў.
АРГАНІЗАТАР: Фонд адукацыйных дзеянняў "КрэАдукацыя" ("Fundacja Działań Edukacyjnych KreAdukacja").

**ГАРАДСКІ МОЛАДЗЕВЫ АКТЫВАТАР - 450-ГОДДЗЕ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ**
Праграма накіраваная на моладзь ва ўзросце 14 – 18 гадоў, якая ў праектных групах будзе апрацоўваць і рэалізаваць тэматычныя міні-праекты, спалучаныя з юбілеем.
АРГАНІЗАТАР: Фонд "Sempre a Frente".

**ПРАГРАМА ГРАНТАЎ І МІКРАГРАНТАЎ „РАЁНЫ КУЛЬТУРЫ"**
Праграма прысвечаная абагачэнню культурнага і сацыяльнага жыцця ў раёнах горада.
Набор праектаў запланаваны да 1 красавіка 2019 г.
**dzielnicekultury.lublin.eu.**

Поўная праграма юбілею даступная на сайце **unia.lublin.eu**

# ЗНАК ЕЎРАПЕЙСКАЙ СПАДЧЫНЫ

Гэтую ўзнагароду атрымліваюць матэрыяльныя і нематэрыяльныя аб’екты, якія маюць сімвалічнае значэнне для гісторыі і культурнай спадчыны Еўропы і з’яўляюцца жывым напамінам супольнай палітычнай рэчаіснасці і гістарычнай памяці кантынента.

EUROPEAN HERITAGE LABEL

Рашэннем міжнароднай групы экспертаў, якая дзейнічае пры Еўрапейская камісіі, 10 сакавіка 2015 г. горад Люблін атрымаў Знак еўрапейскай спадчыны ў якасці месца прыняцця Люблінскай уніі – выключнага сімвала мірнай і дэмакратычнай інтэграцыі дзвюх рэлігійна і этнічна розных краін. Гэтыя ідэі матэрыяльным чынам прадстаўленыя ў краявідзе Лібліна ў выглядзе захаваных архітэктурных помнікаў, што былі сведкамі падпісання Люблінскай уніі і ўвекавечылі яе: капліца святой Тройцы ў Люблінскім замку, помнік Люблінскай уніі і касцёл св. Станіслава, біскупа і мучаніка, а таксама Дамініканскі манастыр.





## КАПЛІЦА СВЯТОЙ ТРОЙЦЫ Ў ЛЮБЛІНСКІМ ЗАМКУ

Капліца святой Тройцы ў Люблінскім замку – гэта адзін з найбольш каштоўных сярэднявечных помнікаў архітэктуры не толькі ў Польшчы, але і ў Еўропе. Капліца атрымала Знак еўрапейскай спадчыны. Яе пабудаваў кароль Казімір III Вялікі, а ўнутры па сённяшні дзень захаваліся цудоўныя візантыйска-рускія фрэскі, стварэнне якіх фінансаваў кароль Ягайла. Гэта ўнікальны ў еўрапейскім маштабе прыклад пранікнення культур Усходу і Захаду, таму што рымска-каталіцкая святыня ўпрыгожаная постацямі айцоў праваслаўнай царквы. Будынак знаходзіцца на тэрыторыі былога каралеўскага замка, у месцы, дзе, паводле легенды, адбываліся нарады пра кшталт Люблінскай уніі.



# БАЗІЛІКА СВ. СТАНІСЛАВА, БІСКУПА І МУЧАНІКА, А ТАКСАМА ДАМІНІКАНСКІ МАНАСТЫР

Базіліка з'яўляецца адным з найбольш каштоўных сакральных аб'ектаў Любліна. Касцёл і манастыр у 1342 г. заснаваў кароль Казімір ІІІ Вялікі. У гэтым касцёле ў 1569 г., пасля падпісання Люблінскай уніі, адбылося падзячнае набажэнства, у якім прымаў удзел кароль Жыгімонт Аўгуст. Святыня ўжо тады была вядомая па-за межамі краіны, дзякуючы таму, што ў ёй знаходзіліся рэліквіі св. Крыжа, адныя з найбуйнейшых у свеце. З рэліквіямі звязана шмат надзвычайных і цудоўных падзей. Паводле адной з легенд, крыжовы ход з ракай уратаваў горад ад трагічнага пажару ў 1719 г. На жаль, рэліквіі, якія на працягу стагоддзяў захоўваліся ў касцёле, у 1991 г. былі скрадзеныя. Манастырскі комплекс дамініканцаў у Любліне з'яўляецца архітэктурным помнікам, які атрымаў Знак еўрапейскай спадчыны. Ён амаль цалкам даступны для наведвання, уключна з галерэяй жывапісу і манастырскай скарбніцай.



# ПОМНІК ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ

Помнік знаходзіцца на Літоўскай плошчы, названай у гонар месца, дзе знаходзілася стаянка гістарычнай літоўскай шляхты падчас люблінскага сейма ў 1569 г. На Кракаўскім прадмесці, недалёка ад гэтага месца, падчас сейма кароль Жыгімонт Аўгуст прымаў ад герцага Альбрэхта Фрыдрыха Прускага прысягу на вернасць, а гэтую падзею апісаў Ян Каханоўскі ў паэме *"Proporzec albo hołd pruski"*. Пазнейшае паданне кажа, што першы помнік быў пастаўлены яшчэ ў час панавання караля Жыгімонта Аўгуста. Захаваны да нашых дзён помнік у выглядзе чыгуннага абеліска на п'едэстале пабудаваны ў 1826 г. па ініцыятыве Таварыства сяброў навук і Станіслава Сташыца на месцы папярэдняга, разабранага ў 1819-1820 гг. Франтальную частку п'едэстала ўпрыгожвае пазалочаны барэльеф, на якім прадстаўленыя дзве алегарычныя постаці ў антычнай вопратцы: Палонія і Літуанія, якія падаюць сабе рукі, што сімвалізуе акт спалучэння уніяй дзвюх вялікіх, шматнацыянальных краін – Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. З іншага боку п'едэстала размешчаны пазалочаны надпіс, які тлумачыць змест прадстаўленага: "Спалучэнне Літвы і Кароны". Помнік Люблінскай уніі з'яўляецца сімвалам полікультурнай і шматрэлігійнай гісторыі Любліна і Рэчы Паспалітай.







*“У гэтага горада ёсць сваё гістарычнае значэнне. Гэта не толькі значэнне Люблінскай уніі, але і ўсяго, што з’яўляецца гістарычным, культурным, этычным і рэлігійным кантэкстам гэтай уніі. Увесь вялізны гістарычны працэс сустрэчы Захаду і Усходу. Узаемнае прыцягненне і адштурхоўванне. Адштурхоўванне, але і прыцягненне. Гэты працэс належыць да ўсёй нашай гісторыі. Можна сказаць, што ўся наша гісторыя знаходзіцца ў цэнтры гэтага працэсу (...). Таму ў справы, на якую сімвалічна паказвае гэты горад – Люблін (...) – не толькі польскі, але і еўрапейскі маштаб. А нават універсальны”.*

Святы Ян Павел II у выступе перад прадстаўнікамі навукі, падчас сустрэчы ў Каталіцкім люблінскім універсітэце, 9 чэрвеня 1987 г.



*“Актуальнасць Люблінскай уніі сёння спалучаецца з Еўрапейскім саюзам, які шукае карані ў грамадска-федэральных традыцыях нашага кантынента. Доўга не заўважалася і недаацэньвалася тое, што Люблінская унія з’яўляецца адной з найважнейшых праяў менавіта гэтай традыцыі, адной з істотных папярэднікаў сённяшняга Еўрапейскага саюза”.*

Прафесар Ежы Клачоўскі, “Люблінская унія. Люблін – горад уніі”, 1999 г., публікацыя з нагоды 430-годдзя падпісання акту Люблінскай уніі.





## АКТ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ

1 ліпеня 1569 г. у Любліне, на агульным сейме прадстаўнікі рады і земскія паслы Вялікага княства Літоўскага абнаўляюць унію з Каралеўствам Польскім. Паўсталая ў выніку уніі краіна – Рэч Паспалітая – з гэтага часу мела аднаго ўладара, агульны сейм, абарону, замежную палітыку і манету.

Акт Люблінскай уніі – арыгінал; польская мова; дакумент на пергаменце, памеры 72 х 45 см + 10 см. Пралог запісаны капітальным квадратным шрыфтам. 77 пячатак на 47 шнурках.

Арыгінал знаходзіцца ў Галоўным архіве старажытных дакументаў у г. Варшаве, Калекцыя пергаментных дакументаў, шыфр 5627.

EUROPEAN HERITAGE LABEL

Lublin CITY OF INSPIRATION ®

Падрабязная інфармацыя
і актуальная праграма знаходзіцца на сайце:

**unia.lublin.eu**

**Lublin700 / Od Unii do Unii**

ВЫДАВЕЦ:

Упраўленне горада Любліна
Плошча караля Уладыслава Лакетка, 1
20-109 Люблін
(Urząd Miasta Lublin
plac Króla Władysława Łokietka 1
20-109 Lublin)
unia@lublin.eu

**ISBN: 978-83-953670-6-9**